Дзіна ДУБІНІНА,
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,
загадчык кафедры методык дашкольнай адукацыі,
Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка*

# ЛЮБЫ КРАЙ БЕЛАРУССЮ ЗАВЕЦЦА...

*І ты яе запомні імя,
Як неба, сонца і зару:
Твая зямля, твая Радзіма
Названа светла —
Бе-ла-русь.*
Ю. СВІРКА

***Асэнсаванне дзецьмі дашкольнага ўзросту нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей, паважлівае стаўленне да культурна-гістарычнай спадчыны, дзейсны ўдзел у яе захаванні выступаюць як вызначальныя задачы патрыятычнага выхавання.***

***Знаёмства з роднай краінай, яе дзяржаўнымі і нацыянальнымі сімваламі фарміруе нацыянальную самасвядомасць, спрыяе сацыялізацыі выхаванцаў. Пачуцці любові да роднага краю і гонару за яго выхоўваюцца ў дзяцей, калі яны спасцігаюць яго мінулае і сучаснасць, знаёмяцца са славутымі імёнамі Бацькаўшчыны.***

***Асноўнай формай патрыятычнага выхавання дзяцей 5—7-гадовага ўзросту выступаюць інтэграваныя заняткі (спецыяльна праектуемая выхавальнікам дашкольнай адукацыі частка адукацыйнага працэсу). Цесная сувязь метадаў вырашэння праграмных задач і ўзаемаўзбагачэнне зместу заняткаў па патрыятычным выхаванні дае падставу інтэграваць такія адукацыйныя вобласці, як «Дзіця і грамадства» і «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін». Засваенне культуралагічнага і краязнаўчага зместу стварае аптымальныя магчымасці для інтэграванага вырашэння пазнавальна-маўленчых задач вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі. Выхавальнік дашкольнай адукацыі мае права самастойна выбіраць і будаваць змест заняткаў у адпаведнасці з індывідуальна-дыферэнцыраваным падыходам. У працэсе заняткаў выхаванцы спасцігаюць новы сэнс, набываюць пэўны сацыяльны вопыт, у іх узбагачаецца слоўнікавы запас, развіваецца звязнае маўленне.***

***Работа, распачатая ў час заняткаў, працягваецца ў працэсе сітуацыі зносін — спецыяльна праектаванай педагагічным работнікам часткі адукацыйнага працэсу, якая накіравана на практыкаванне дзяцей у засваенні праграмнага матэрыялу па пэўнай тэме ў нерэгламентаванай дзейнасці. Сітуацыя зносін прадугледжвае свабодную арганізацыю дзяцей і плануецца ў раздзеле «Зносіны» плана адукацыйнай дзейнасці.***

# БЕЛАРУСЬ — МАЯ КРАІНА

## ІНТЭГРАВАНЫЯ ЗАНЯТКІ ПА АДУКАЦЫЙНЫХ АБЛАСЦЯХ «ДЗІЦЯ І ГРАМАДСТВА» І «РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ І КУЛЬТУРА МАЎЛЕНЧЫХ ЗНОСІН» ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ СТАРШАЙ ГРУПЫ (5—6 гадоў)

**Праграмныя задачы:** фарміраваць у дзяцей уяўленні пра геаграфічнае размяшчэнне Рэспублікі Беларусь; замацоўваць уменне канструяваць граматычна правільнае выказванне; узбагачаць слоўнік на аснове паглыблення ведаў пра прадметы і з'явы наваколля; развіваць памяць; выхоўваць пачуцці любові да роднага краю і гонару за яго.

**Матэрыял і абсталяванне:** фізічная карта Рэспублікі Беларусь, палітычная карта свету, сілуэты звяроў (мыш, зубр, ліса, воўк, мядзведзь), ліст клёна, мяч.

### Ход заняткаў

**Выхавальнік дашкольнай адукацыі (В.д.а.).** Паслухайце верш «Цудоўная краіна» Васіля Жуковіча і здагадайцеся, пра якую краіну ў ім ідзе размова.

На свеце існуе такая краіна,
Дзе хвоі ажно дастаюць аблачыны,
Дзе рэкі, азёры ў суседстве з лясамі,
Напоўненымі салаўёў галасамі.
У гэтай краіне ўзгоркі, раўніны
Ўлетку накрыты густой зелянінай;
Ляночак цвіце з небам сінім у згодзе.
Тут песні і казкі з легендамі ходзяць.
У гэтай краіне ля хатаў буслянкі,
А ў хатах пяшчотна гучаць калыханкі.

Ці ведаеце вы, што гэта за краіна? *(Адказы дзяцей.)*

Радзімаю нашай край гэты завецца.
Хай нашай Радзіме шчасліва жывецца!

Наша радзіма — ... *(Беларусь)*. На вашу думку, чаму нашу краіну так называюць? *(Адказы дзяцей.)* Гавораць, што краіна атрымала такую назву ад белага колеру льняной вопраткі, ад светлых валасоў і вачэй яе жыхароў, белых буслоў, якіх шмат у Беларусі. Вось як аб гэтым распавядае паэт Уладзімір Скарынкін:

Беларусь мая! Чыстая мая! Родная мая!
Белыя гоні бульбы, белыя косы дзяўчат.
Воблакаў белых над Бугам вечны парад.
Белых грыбоў кашолкі, белыя плечы бяроз,
Белыя россыпы золкіх чыстых світальных рос.
Белых туманаў плыні, белыя вершы буслоў.
Ціхая завадзь Бялыніч, рык белавежскіх зуброў.
Вейкі рамонкаў белых, белыя грывы завей.
Чыстыя душы смелых, простых тваіх людзей.

Увогуле, белы колер — гэта сімвал свабоднага жыцця. Белая — значыць свабодная, вольная. Наша Беларусь — краіна... *(свабодная, вольная)*. Як называюцца людзі, што жывуць у Беларусі? *(Беларусы.)* Пра хлопчыка гавораць... *(беларус)*, а пра дзяўчынку... *(беларуска)*.

**1-я дзяўчынка.**
Твар румяненькі,
Белая хустачка.
Я ўжо ведаю,
Я — беларусачка!
І хачу
Так, як тата і мама,
Родны край свой любіць
Я таксама!

**А. Бадак**

**1-ы хлопчык.**
Я — беларус маленькі
З блакітнымі вачыма.
Хачу і я, каб лепей
Жыла мая Радзіма.

**М. Маляўка**

**В.д.а.** Родная мова беларусаў — ... *(беларуская)*.

**2-і хлопчык.**
Я нарадзіўся беларусам,
Беларусам буду жыць!
Мову родную вучуся
Шанаваць, цаніць, любіць!

**В. Швед**

**В.д.а.** Поле ці лес, рэчка ці возера, вёска, маленькі пасёлак ці горад — гэта нашы родныя... *(беларускія)* мясціны.

**2-я дзяўчынка.**
Куточак зямлі, дзе бярозкі шумяць,
Дзе ясныя зоркі ў азёры глядзяць,
Дзе клёкат бусліны нам песняй гучыць,
Куточак зямлі, як цябе не любіць!
Мы лёсам адзіным з табою жывём,
Ласкава цябе Беларуссю завём.

**Я. Жабко**

**В.д.а.** Беларусь — наша Бацькаўшчына. Што такое Бацькаўшчына? *(Адказы дзяцей.)* А вось як на гэта пытанне адказаў паэт Пімен Панчанка:

Што такое Бацькаўшчына?
Знаеш?

Гэта рэчка, сцежачка лясная,
Гэта ў лузе залатая пчолка,
А ў вачах тваіх — вясёлка.
Бацькаўшчына — гэта дом твой,
Школа,
Гэта песні, што звіняць наўкола,
Гэта сам ты,
Гэта тата твой і мама.
І сябры твае таксама.

Мы тут нарадзіліся, жывём, тут жывуць нашы бацькі, дзяды, жылі нашы продкі. Беларусы якія людзі? *(Адказы дзяцей.)* Сапраўды, беларусы — працавітыя, гасцінныя, спагадлівыя, шчодрыя, гатовыя заўсёды прыйсці на дапамогу, вельмі добрыя і шчырыя.

## Фізкультмінутка

Добры дзень, сонейка залаценькае!
*(Выцягваюць рукі ўперад, некалькі разоў разводзяць пальцы.)*

Добры дзень, сонейка міленькае!
*(Уздымаюць рукі ўверх.)*

Добры дзень, неба блакітнае!
*(Падскокваюць на месцы.)*

Добры дзень, ветрык павольны!
*(Паварочваюцца вакол сябе ўлева, потым — управа.)*

Добры дзень, дрэвы і кветкі!
*(Нахіляюцца ўперад.)*

Добры дзень, бары і палеткі!
*(Нахіляюцца ў бакі.)*

Добры дзень, дарагія сябры!
*(Крочаць на месцы, пляскаюць у далоні.)*

*Дзецям дэманструюць палітычную карту свету, паказваюць, дзе на ёй знаходзіцца Беларусь, адзначаюць, што яна займае невялікую тэрыторыю.*

## Гульнявое практыкаванне «Беларусь на карце»

Дзецям прапануюць паглядзець на сілуэты звяроў (мыш, зубр, ліса, мядзведзь, воўк), назваць іх, потым звярнуць увагу на фізічную карту Рэспублікі Беларусь і вызначыць, на які сілуэт падобны яе контур.

**В.д.а.** Беларускі пісьменнік Васіль Вітка лічыць, што Беларусь выглядае на карце, як зялёны лісток. Паслухайце, як ён расказаў пра гэта ў сваім вершы:

На карце вялікага свету
Яна — як зялёны лісток,
Адвечная калыханка,
Душы запаветны куток.

Ці згодны вы з пісьменнікам? Чаму? На лісток якога дрэва падобныя абрысы Беларусі? *(Адказы дзяцей.)* Правільна, на лісток клёна.

У нашай краіне жывуць не толькі беларусы, але і людзі іншых нацыянальнасцей. Пра нашу краіну кажуць — шматнацыянальная. Побач з беларусамі тут жывуць рускія, палякі, украінцы, літоўцы, яўрэі, татары... Наша Насця — руская, Алег — украінец. *(Педагагічны работнік называе імёны дзяцей групы і іх нацыянальнасці.)* Але мы ўсе — сябры.

*Выхавальнік дашкольнай адукацыі знаёміць дзяцей з вершам, у адпаведных месцах робіць паўзу, а дзеці дадаюць слова «беларусы».*

Ёсць такі народ працавіты,
Вельмі шчыры
І самавіты — ... *(беларусы).*
Ёсць такі
Народ памяркоўны
І прыветлівы,
І тактоўны — ... *(беларусы).*
Ёсць такі
Народ гераічны,
А на выгляд
Сціплы і звычны — ... *(беларусы).*
Ёсць такі
Народ неўміручы,
Неадольны,
Вечна жывучы — ... *(беларусы).*

**А. Дзеружынскі**

**В.д.а.** Давайце пералічым якасці, уласцівыя беларусам.

## Гульня «Якасці беларусаў»

Дзеці становяцца кругам, выхавальнік дашкольнай адукацыі кідае кожнаму па чарзе мяч і прапануе назваць якасці, уласцівыя беларусам, адказаўшы на пытанне «Беларусы якія?». *(Працавітыя, шчырыя, самавітыя, памяркоўныя, тактоўныя, прыветлівыя, добрыя, сціплыя, добразычлівыя, сардэчныя, гасцінныя і г.д.)*

**В.д.а.**
Радзіма ў нас бязмежная,
Спякотная і снежная.
Радзіма ў нас лагодная,
Нібы матуля родная.
А самае галоўнае:
Усе ёй дзеці роўныя.

**А. Вольскі**

## Рэфлексія

Дзецям прапануюць прадоўжыць выказванні:

- Сёння мы даведаліся, што...

- Мы любім сваю родную Беларусь, таму што...

# ЯК ТЫ СЭРЦУ МАЙМУ МІЛА!

## ІНТЭГРАВАНЫЯ ЗАНЯТКІ ПА АДУКАЦЫЙНЫХ АБЛАСЦЯХ «ДЗІЦЯ І ГРАМАДСТВА» І «РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ І КУЛЬТУРА МАЎЛЕНЧЫХ ЗНОСІН» ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ СТАРШАЙ ГРУПЫ (5—6 гадоў)

**Праграмныя задачы:** фарміраваць у дзяцей уяўленні пра выдатныя мясціны Беларусі, яе краявіды; замацоўваць уменне ўтвараць назоўнікі, складаць звязныя апісанні краявідаў; выхоўваць пачуццё любові да роднага краю.

**Матэрыял і абсталяванне:** фотаздымкі 4—5 беларускіх краявідаў (па выбары педагагічнага работніка), гульня «Лато краявідаў», мяч.

### Ход заняткаў

*Выхавальнік дашкольнай адукацыі знаёміць дзяцей з урыўкам з апавядання «Маленькі чалавек у вялікім свеце» А. Бадака.*

**В.д.а.** Мы з вамі слухалі ўрывак з апавядання «Маленькі чалавек у вялікім свеце» Алеся Бадака, у якім расказваецца пра нашу Беларусь, а цяпер паслухайце верш «Мой край» А. Русака.

Куды ні глянь — лясы шумяць,
Цвіце за полем гай,
А поле — вокам не абняць.
І гэта ўсё — мой край.
Жыве, працуе мой народ
Ці ў снежань, ці ў май,
І харашэ з году ў год
Мой родны, вольны край.

### Гульня «Пазнай па апісанні»

На дошцы прымацаваны фотаздымкі беларускіх краявідаў. Выхавальнік дашкольнай адукацыі апісвае адзін з іх, дзеці здагадваюцца які, паказваюць і (па магчымасці) называюць.

**В.д.а.** Беларусь — наш агульны родны край, але ў кожнага з нас ёсць у Беларусі мілы сэрцу куток — горад або вёска. Як называецца месца, дзе мы з вамі жывём? *(Адказы дзяцей.)* Наш горад *(ці вёска, вымаўляе назву)* — гэта маленькая частка вялікай Радзімы, якая носіць светлае і прыгожае імя — Беларусь.

### Гульня «Лато краявідаў»

**Варыянт 1.** Дзецям прапануюць разглядзець фотаздымкі, на якіх адлюстраваны памятныя месцы і жывапісныя куткі Беларусі, і назваць іх. Пасля раздаюць усім гульцам пароўну карткі з тымі ж выявамі. Дарослы дэманструе фота, гулец, які мае такую ж картку, уздымае руку, называе выяву і расказвае, дзе аб’ект знаходзіцца. Калі ён не памыліўся, атрымлівае фішку. У каго будзе больш фішак, той — пераможца.

**Варыянт 2.** На стале раскладваюць фотаздымкі, на якіх адлюстраваны памятныя месцы і жывапісныя куткі Беларусі, сумесна разглядаюць і называюць іх. Выбіраюць водзячага, ён апісвае аб’ект, адлюстраваны на фота, і гулец, які правільна назаве яго, атрымлівае фішку і становіцца водзячым. У каго будзе больш фішак, той — пераможца.

### Фізкультмінутка «Мой край»

Куды ні глянь — лясы шумяць,
Цвіце за полем гай,
*(Падымаюць рукі ўверх, гойдаюцца з боку ў бок.)*
А поле — вокам не абняць.
І гэта ўсё — мой край.
*(Разводзяць рукі ў бакі, кружацца ўлева, потым — управа.)*
Жыве, працуе мой народ
Ці ў снежань, ці ў май,
*(Выконваюць прысяданні.)*
І харашэ з году ў год
Мой родны, вольны край.
*(Падскокваюць на месцы.)*

**А. Русак**

**В.д.а.** Мы з вамі — жыхары... *(называе населены пункт)*. Значыць, вас можна назваць... *(Адказы дзяцей.)* Людзей, якія жывуць у горадзе, называюць... *(гараджанамі)*, а тых, хто жыве ў вёсцы... *(вяскоўцамі)*. Пра каго са сваіх родных вы можаце сказаць, што ён гараджанін або вясковец? Чаму? *(Адказы дзяцей.)* А як называюць хлопчыка або дзяўчынку, якія жывуць у Мінску? *(Адказы дзяцей.)*

Паспрабуйце цяпер расказаць кожны пра сябе. Я жыву ў... *(назва горада або вёскі)*. Значыць, я... *(гараджанін або вясковец)*.

# О, КРАЙ РОДНЫ, КРАЙ ПРЫГОЖЫ!

## ІНТЭГРАВАНЫЯ ЗАНЯТКІ ПА АДУКАЦЫЙНЫХ АБЛАСЦЯХ «ДЗІЦЯ І ГРАМАДСТВА» І «РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ І КУЛЬТУРА МАЎЛЕНЧЫХ ЗНОСІН» ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ СТАРШАЙ ГРУПЫ (5—6 гадоў)

**Праграмныя задачы:** фарміраваць у дзяцей уяўленні пра багацце прыроды Беларусі, яе выдатныя мясціны; замацоўваць уменне састаўляць творчае апавяданне пра навакольную прыроду, апісваць жывёл і птушак; развіваць логіку, пазнавальную матывацыю; выхоўваць каштоўнасныя адносіны да прыроды.

**Матэрыял:** малюнак карты Беларусі з прадстаўнікамі расліннага і жывёльнага свету, фотаздымкі возера Нарач і Белавежскай пушчы, мяч, карткі з выявамі лесу, лугу, возера, тыповых прадстаўнікоў раслін і жывёл.

### Ход заняткаў

**Выхавальнік дашкольнай адукацыі (В.д.а.).** Вы сёння зранку ішлі ў дзіцячы сад. Што бачылі цікавага? Назавіце дрэвы, што сустракаліся па дарозе. Назавіце кветкі. Ці заўважылі вы птушак? Якіх? Якое сёння надвор'е? Якога колеру неба? Ці ёсць на ім сонейка, воблачкі? *(Адказы дзяцей.)* Паслухайце, якія краявіды ўбачыў і апісаў у сваім вершы паэт Васіль Жуковіч:

Лес ідзе да небакраю,
Рэчка, горачка, раўніна —
Вечна сэрцу дарагая
Беларуская карціна.

Што ўбачыў паэт, пра што расказаў у вершы? *(Лес, рэчка, горачка, раўніна.)* Ці можам мы здагадацца, дзе жыў паэт? *(Так, у вёсцы.)*

*Дзецям прапануюць паглядзець малюнак карты Беларусі з прадстаўнікамі расліннага і жывёльнага свету і назваць аб'екты прыроднага наваколля на ёй.*

**В.д.а.** Гэта карта незвычайная. На ёй можна ўбачыць некаторыя расліны, птушак і жывёл, якія ёсць у нашай краіне. Давайце іх разгледзім. *(Сумесна разглядаюць і называюць, ужываюць абагульняючыя словы.)*

Ці заўважылі вы на карце аб'екты прыроды, пра якія не расказваецца ў вершы В. Жуковіча? Назавіце іх. *(Адказы длзяцей.)* Так, гэта — возера. Называецца яно Нарач. *(Дэманструе на карце і паказвае фотаздымак возера Нарач.)* Нарач — самае вялікае возера ў нашай краіне. Яго лічаць «жамчужынай Беларусі», «беларускім морам». Беларусь яшчэ называюць «зямлёй з блакітнымі вачамі». Калі вы пільна паглядзіце на карту, то здагадаецеся чаму. *(Адказы дзяцей.)*

На малюнку вы заўважылі вялікі лес — гэта Белавежская пушча, гонар Беларусі, бо такіх лясоў ва ўсім свеце толькі тры. *(Дэманструе на карце і паказвае фотаздымак Белавежскай пушчы.)* Гэта нацыянальны парк, у якім знаходзіцца шмат рэдкіх раслін, птушак і жывёл. Самы славуты жыхар пушчы — белавежскі зубр.

Назавіце расліны, звяроў і птушак, якіх вы ўбачылі на карце. Якія з іх вылучаюцца сваёй велічынёй? *(Зубр, бусел, сасна і васілёк.)* Яны з'яўляюцца яшчэ і нацыянальнымі сімваламі Беларусі, таму што яны звязваюцца з існаваннем нашай краіны.

### Гульня «Рухі»

Калі дзеці пачуюць назву птушкі, ім прапануюць «лётаць», назву жывёлы — «бегчы», рыбіны — «плысці», насякомага — «скакаць», земнаводнага — «паўзці».

### Гульня «Ланцужкі»

Выхавальнік дашкольнай адукацыі называе абагульняючае слова і адзін з аб'ектаў, які ўваходзіць у дадзеную групу, перадае дзецям мяч па крузе, яны працягваюць ланцужок слоў далей. Напрыклад: дрэвы — асіна, бяроза і г.д.

### Фізкультмінутка «Наша краіна»

Мы жывём у той краіне,
Дзе азёрыззяюць сінім.
*(Рукі ў бакі, робяць «спружынку».)*

Дзе лясы амаль да неба,
*(Рукі ўверх, цягнуцца, паўстаюць на дыбачкі.)*

Дзе палі паўнюткі хлебам.
*(Рукі ўніз, нахіляюцца.)*

Рэк блакітныя сцяжынкі,
*(Рукі разводзяць у бакі, цягнуцца ўлева, управа.)*

Маем кожны год «Дажынкі».
*(Пляскаюць у далоні.)*

А буслы жывуць на хатах,
Вучаць лётаць буслянятаў.
*(«Ляцяць».)*

Дзе гучыць матулі мова,
Дзе ўсё заўжды знаёма.
*(Крочаць на месцы ў чарагаванні з падскокамі.)*

**С. Брандт**

### Гульня «Ці то дрэва, ці то звер?»

Дзеці становяцца кругам. Выхавальнік дашкольнай адукацыі пачынае сказ і кідае мяч аднаму з выхаванцаў, які заканчвае сказ, дадаўшы адно слова, і вяртае мяч выхавальніку дашкольнай адукацыі.

Дуб — гэта дрэва, а мядзведзь — ... *(звер)*.

Мядзведзь — гэта звер, а бяроза — ... *(дрэва)*.

Бяроза — гэта дрэва, а ліса — ... *(звер)*.

Ліса — гэта звер, а елка — ... *(дрэва)*.

Елка — гэта дрэва, а воўк — ... *(звер)*.

Воўк — гэта звер, а сасна — ... *(дрэва)*.

Сасна — гэта дрэва, а зайчык — ... *(звер)*.

### Гульня «Здагадайся па апісанні»

Выхавальнік дашкольнай адукацыі прымацоўвае да дошкі фотаздымкі і апісвае прыкметы возера Нарач або Белавежскай пушчы, дзеці называюць, што апісана:

- «жамчужына» Беларусі;
- нацыянальны парк Беларусі;
- самая чыстая і празрыстая вада;
- шмат рэдкіх раслін, птушак і жывёл;
- «беларускае мора».

### Гульня «Лес, луг, возера»

На дошцы прымацоўваюць выявы лесу, лугу, возера і прапануюць суаднесці з імі карткі з выявамі тыповых прадстаўнікоў раслін і жывёл.

**В.д.а.** Паслухайце, як прыгожа расказвае пра нашу Радзіму пясняр Беларусі Якуб Колас:

О, край родны, край прыгожы,
Мілы кут маіх дзядоў!
Што мілей у свеце белым
Гэтых светлых берагоў,
Дзе бруяцца срэбрам рэчкі,
Дзе бары-лясы гудуць,
Дзе мядамі пахнуць грэчкі,
Нівы гутаркі вядуць?

Паэт нашу краіну называе край... *(родны, прыгожы, мілы кут)*.

*Дзецям прапануюць прадоўжыць фразу «Я люблю Беларусь, таму што...».*

# «У СВЕЦЕ ЗНАЮЦЬ НЕЗДАРМА...»

## ІНТЭГРАВАНЫЯ ЗАНЯТКІ ПА АДУКАЦЫЙНЫХ АБЛАСЦЯХ «ДЗІЦЯ І ГРАМАДСТВА» І «РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ І КУЛЬТУРА МАЎЛЕНЧЫХ ЗНОСІН» ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ СТАРШАЙ ГРУПЫ (6—7 гадоў)

**Праграмныя задачы:** фарміраваць у дзяцей уяўленні пра людзей, якія ўславілі нашу Радзіму, пра вобласці і абласныя цэнтры Беларусі, пра найбольш распаўсюджаныя віды прадукцыі, якія выпускаюцца на беларускіх прадпрыемствах; замацоўваць прадстаўленні пра геаграфічнае размяшчэнне Рэспублікі Беларусь, уменне разгорнута адказваць на пытанні, тлумачыць выказванні; развіваць увагу, памяць, кемлівасць; выхоўваць патрыятычныя пачуцці.

**Матэрыял і абсталяванне:** драўляны развіваючы пазл «Карта Беларусі», ілюстрацыі з выявамі славутых людзей Беларусі, буйных беларускіх прадпрыемстваў і іх прадукцыі.

### Ход заняткаў

**Выхавальнік дашкольнай адукацыі (В.д.а.).** Мы ўжо з вамі ведаем, як называецца наша краіна. *(Беларусь.)* Беларусь — гэта наша... *(Радзіма)*.

Паглядзіце, якая незвычайная ў нас сёння карта. *(Звяртае ўвагу дзяцей на драўляны развіваючы пазл «Карта Беларусі».)* Вось гэта Беларусь. Побач з ёй знаходзяцца краіны-

суседзі. Паслухайце, як у вершы паэт Юрась Свірка расказвае, з кім мяжуе Беларусь.

Мяжуе з Польшчай, Украінай,
Расіяй, Латвіяй, Літвой.
Твой родны край, твая Айчына —
Жыццё тваё і гонар твой.

### Гульнявое практыкаванне «Суседзі нашай краіны»

Спачатку выхавальнік дашкольнай адукацыі на драўляным развіваючым пазле паказвае межы Беларусі і краіны-суседкі, называе іх: Расія, Украіна, Літва, Латвія, Польшча. Затым дзецям прапануецца паглядзець на карту і назваць па чарзе краіны, з якімі мяжуе Беларусь, а дарослы паказвае межы з названай краінай.

### Гульнявое практыкаванне «Часткі роднай краіны»

Дзецям прапануюць скласці драўляны развіваючы пазл «Карта Беларусі» з 6 элементаў (абласцей) і адказаць на пытанні:

- Колькі абласцей у нашай краіне? Пералічыце іх.

- Якім колерам абазначана Магілёўская вобласць? Пакажыце яе на карце (і г.д. усе вобласці).

- Назавіце абласны цэнтр (і г.д. усе абласныя цэнтры).

- У якой вобласці жывём мы?

**В.д.а.** Мы ўжо ведаем з вамі, што мы — ... *(беларусы)*, дзяўчынка, што нарадзілася ў Беларусі... *(беларуска)*, а хлопчык... *(беларус)*. Беларусы — мірны і працалюбівы народ. Мы жывём са сваімі суседзямі ў згодзе і ганарымся тым, што наша краіна міралюбівая.

### Фізкультмінутка «Беларусь»

Усяму вядомы свету
Наш руплівы край здавён.
*(Крочаць на месцы.)*

Тут на сонечных палетках
Спеюць бульба, жыта, лён.
*(Імітуюць збор ураджаю.)*

Тут умельцы вырабляюць
Слаўны трактар «Беларус».
*(Імітуюць біццё молатам.)*

Тут ствараюцца БелАЗы —
Трохсоттонны везці груз.
*(Імітуюць працу рухавіка.)*

Тут сыны лятуць у космас,
Песні матчыны пяюць...
*(Імітуюць палёт.)*

Гэты край наш найдзівосны
Беларуссю ўсе завуць.
*(Падскокваюць на месцы, пляскаюць у далоні.)*

**М. Пазнякоў**

**В.д.а.** Паслухайце, як расказвае пра сябе і родную Беларусь А. Баравы.

**Хлопчык.**
Я — беларус. Я ганаруся
Сваёй гісторыяй, людзьмі,
І тым, што тут я нарадзіўся,
Што прадзеды мае жылі.
Я ганаруся кожным дрэвам
І кожнай рэчкай, што бяжыць,
Зялёным лугам, чыстым небам,
Расой, што на траве блішчыць.

*Дзеці ўслед за выхавальнікам дашкольнай адукацыі паўтараюць вершаваныя радкі:*

Аб добрай славе Беларусі
У свеце знаюць нездарма.

**В.д.а.** Як вы думаеце, што гэта значыць? Хто здабыў Беларусі яе добрую славу? *(Адказы дзяцей.)* Галоўны скарб нашай краіны — людзі! Яны ўслаўляюць сваю зямлю, нясуць у свет яе добрае імя. Ва ўсім свеце ведаюць нашых навукоўцаў, мастакоў, кампазітараў, касманаўтаў, спартсменаў. Назавіце знакамітых людзей Беларусі. *(Адказы дзяцей.)*

*У залежнасці ад выказванняў дзяцей педагагічны работнік будуе кароткую гутарку аб славутых людзях Беларусі.*

**В.д.а.** *(падсумоўвае)*. Добрую славу Беларусі здабываюць не толькі знакамітыя людзі, але і якасная прадукцыя нашых прадпрыемстваў, дзе працуюць вашы бацькі. Ці можна сказаць, што сёння добрую славу Беларусь набывае дзякуючы плённай працы вашых бацькоў? *(Так.)*

*Дзецям прапануюць разгледзець ілюстрацыі з выявамі буйных беларускіх прадпрыемстваў і іх прадукцыі, асабліва спыняючыся на тых, якія месцяцца ў рэгіёне, і тых, дзе працуюць бацькі выхаванцаў.*

**В.д.а.** Чым сёння ганарацца беларусы? У свеце ведаюць і магутныя самазвалы «МАЗ», і трактары «Беларус», і нашу калійную соль. Якія славутыя беларускія прадпрыемствы ведаеце вы? *(Адказы дзяцей.)*

*Кожнаму выхаванцу прапануецца закончыць сказ «Я сёння даведаўся, што...».*

*Працяг у наступных нумарах.*